У ДЗЯРЖЫНСКУ ПРАЕЗДАМ

Той, хто чакае ад падарожжа нечага незвычайнага, наўрад ці выправіцца па гэта ў горад, звычайнасць якога здаецца ўзведзенай у ступень. Яшчэ Сыракомля пісаў пра яго, што нічым ён, акрамя старажытнасці, не вылучаецца. З той пары і ад старажытнасці следу заўважнага не засталося. Тым не менш не заехаць сюды па дарозе да чаго-небудзь больш захапляльнага — значыць, зрабіць памылку.

Кальвінскі збор на акварэлі Саўэрмільха...

...і на фотаздымку пачатку XX стагоддзя.

Сыракомля быў тут у сярэдзіне XIX стагоддзя, калі гэта было яшчэ Койданава, складзенае, як ён пісаў, з дзвюх ці трох соцень сасновых дамкоў, большая частка якіх — «аж занадта знаёмыя корчмы». Згадаў, што Жыгімонт III у 1588 годзе надаў Койданаву два кірмашы, «цяпер змізарнелыя». Корчмаў з той пары значна паменела, а кірмашы замяняе рынак. Хоць адзін ён, але затое штодзённы і круглагадовы, і гандаль на ім такі размаіты і бойкі, што нават і гэтая акалічнасць можа стаць нагодай сюды завітаць. Тут, што цікава, гандлююць сярод іншага тым, чым і тады гандлявалі, — гліняными міскамі, глякамі і гаршкамі, драўлянымі грэбнямі, ступамі, таўкачамі. Набыўшы нешта гэткае ў сучаснага прадаўца, на горад з даўно ўжо не аднымі сасновымі дамкамі паглядзіш, нібы Сыракомля. І тады першым, што захочацца зверыць з мінулым, будзе касцёл Святой Ганны. «Сціплы і знадворку, і ўсярэдзіне», усё ж ён даволі заўважны аб'ект для вандроўніка, які ўязджае ў Дзяржынск з боку Заслаўя.

Без малога шэсць соцень гадоў яму, а паверыць у гэта складана. І ўсё таму, што будаваўся ён з дрэва і ўзводзіўся наноў шмат разоў. Зрэшты, пра некаторыя драўляныя храмы — тыя з іх, якія, колькі б ні гарэлі, заўсёды неяк хутка ўзнаўляліся, — можна сказаць інакш: калі дзверы іх шырока расчынены для людзей, то самі яны, быццам людзі, якія маюць насцеж расхінутыя сэрцы, ніколі не выглядаюць на свой узрост. Сціпласць і адкрытасць — галоўныя скарбы людзей і храмаў. А гледзячы ў ясныя вітражныя вочы касцёла Святой Ганны, можна зразумець яшчэ і тое, як важна захоўваць цвёрдасць пазіцыі. Храм стаіць на сваім фундаменце ажно з 1439 года. Значыць, бачыў ён усё тое цікавае і разам з тым вартае жалю, што ў мінулыя стагоддзі адбывалася побач.

На адлегласці, якую лёгка памераць крокамі, можна прыкмеціць невысокі пагорак. Парослы травой, дзе-нідзе ён дэманструе аголенасць у выглядзе ўпарадкаваных камянёў. Так, як цяпер ляжаць, яны былі пакладзены яшчэ ў XVI стагоддзі, але таго, што яны сабой утваралі, — Койданаўскага замка — не існуе ўжо амаль стагоддзе. Пагорак і шыльда з надпісам «Гарадзішча» — гэта ўсё, што засталося ад велічы пад назвамі Гаштольдава гара, а пазней Кальвіншчына. А ўсё, спадарства, праз прагнасць тых, хто тут гаспадарыў: адбілася яна моцна на шляхце, якая зрабілася інструментам інтрыг і страціла традыцыі свае старадаўнія, асабістае паставіўшы вышэй за любоў да Айчыны. Такое не праходзіць дарэмна, за такое заўсёды патрабуецца плата, хоць часам і з адтэрміноўкай. Варта пра гэта падумаць, шукаючы адказ на пытанне, чаму адны гістарычныя помнікі разбураюцца, самі сабе аддадзеныя, а другія і час не бярэ, і людзі шануюць. Рытарычным гэтае пытанне толькі здаецца...

Ад высокіх муроў з байніцамі і зубцамі ды ад гельвецкай царквы, што за тымі мурамі стаяла, ад таго, што паспелі намаляваць Напалеон Орда ў ліпені 1876-га і Курт Саўэрмільх у маі 1918- га, засталіся, як бачым, пагорак і камяні. На алтары царквы — Сыракомля сведка — ляжала некалі Брэсцкая біблія: ён яе на свае вочы бачыў. А пад алтаром, у скляпенні захоўваліся труны з целамі Радзівілаў. Калі б трошкі іншыя лёс і гісторыя дасталіся гэтаму храму (мо, калі б маліліся ў ім трошкі больш), тады радзівілаўская крыпта, што ў Нясвіжы, была б у нас не адзінай, і ехалі б вандроўнікі ў Дзяржынск такім самым арганізаваным парадкам. Але гісторыю не перапішаш...

А вось напісаць яе — акварэлькаю, на прывале, у дарожным альбоме, падчас адпачынку — цалкам верагодная справа. Зірніце на акварэль Курта Саўэрмільха з Германіі, які апынуўся ў Койданаве, бо быў прызваны ў войска ў Першую сусветную вайну і трапіў ваяваць на Усходні фронт. Нарадзіўся ён, праўда, у Варшаве, калі бацька і маці ўцякалі з Санкт-Перцярбурга, бо бацька, служачы там капельмайстрам, здзейсніў замах на цара. Такі вось фінт лёсу. Злева на акварэльцы — бачыце? — вежа касцёла Святой Ганны, які і сёння стаіць, і вежы чарговы раз новыя. Справа — гаротная царква кальвіністаў, таксама з вежай. Саўэрмільх заспеў яе ўжо без гадзінніка, але да 1913 года ён на гэтай вежы дакладна быў. На малюнку Орды гадзінніка таксама няма: мо, *яшчэ* няма?..

Мастакі-летапісцы і летапісцы-пісьменнікі — найлепшыя экскурсаводы, не ў крыўду сённяшнім кажучы. Што яшчэ паведаміць нам Сыракомля?

Кажа, што нядаўна ўзведзеная цэркаўка (гэта ўжо ў цэнтры, на плошчы, на скрыжаванні сённяшніх Першай і Другой Ленінскіх, Маркса і Кастрычніцкай, асвечаная як Свята-Пакроўская) вельмі хораша спалучае італьянскі стыль з візантыйскім. І больш пра яе нічога. Праўда, яшчэ адзін «экскурсавод», Павел Шпілеўскі, кажа, што ў гэтай царкве захоўвалася калісьці ікона з надпісам «Крутагор'е 1146». Крутагор'е — яшчэ адна назва Дзяржынска, ранейшая, перад Койданавам. Атрымліваецца, што Дзяржынску, які нічым не адметны, у які сучасны, спрактыкаваны, распешчаны цікавінкамі падарожнік наўрад ці збярэ свой рукзак, па-першае, перапала ад гісторыі ажно тры назвы, а па-другое, налічваецца самае малое 872 гады. На самай справе больш, бо перш чым пісаць на іконе назву паселішча, трэба яго збудаваць. Ды і назвы зусім не тры. У самым пачатку XVI стагоддзя, калі з сям'ёй тагачасных уладальнікаў парадніўся Альбрэхт Гаштольд, некаторыя дакументы ўпаміналі населены пункт як Гаштольдава. А на зары існавання гэтае месца называлася жыхарамі Акопішчам. Адзін, два, тры, чатыры, пяць... Пяць — гэта лік, на якім грунтуюцца шмат якія законы светабудовы.

Адзін, два, тры, чатыры, пяць... Рынак, касцёл Святой Ганны, месца былога замка, Свята-Пакроўская цэркаўка... Хедэр! Мы не зірнулі на хедэр. А Сыракомля пісаў, што сэрца горада — яўрэйскія бажніцы, бо хрысціянства тут «на другім плане». Хедэр лёгка заўважыць, калі рухацца ад касцёла ў цэнтр горада па Першамайскай. Драўляны двухпавярховы будынак вельмі простага выгляду пафарбаваны ў колер, дзякуючы якому, калі верыць даўняй яўрэйскай легендзе, зло, прымаючы фарбу за кавалачак неба, ніколі не апусціцца на горад.

Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.

Извещение о проведении 87-го открытого аукциона по продаже земельных участков в Солигорском районе 3 января 2019 г.

№ лота	1	2	3	4
Предмет аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка			
Адрес земельного участка	**Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Чижовка, ул. Рябиновая, 15**	**Солигорский р-н, Зажевичский с/с, аг. Зажевичи, ул. Школьная, 27**	**г. Солигорск, ул. К. Заслонова, между домами № 59 и № 61**	**Солигорский р-н, г. п. Старобин, ул. Коржа, 13**
Кадастровый номер	625085412601000462	625081701601000925	625050100001003126	625056200001001990
Площадь, га	0,1549	0,1520	0,1606	0,0911
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение)	Размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома)		Размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание объекта «Магазин между домами № 59 и № 61 по ул. Константина Заслонова в г. Солигорске»)	Размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание торгового павильона)
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории*	Имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения и газоснабжения	Имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения и связи	Имеется транспортная и инженерная инфраструктура	Имеется транспортная и инженерная инфраструктура
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Ограничений в использовании земель нет	Земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0017 га	Земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0168 га, электрических сетей – 0,0012 га, сетей и сооружений теплоснабжения – 0,0792 га, электрических сетей – 0,0148 га	Земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0157 га
Начальная цена продажи, руб.	949,94	1 306,04	26 455,64	4 845,75
Сумма задатка, руб.	189,00	261,00	5 291,00	969,00
Срок аренды земельного участка / условия продажи	30 лет / см. пункт 6	30 лет / 1. обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. см. пункт 6	10 лет / 1. обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. см. пункт 6	20 лет / 1. обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. см. пункт 6
Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	73,50	2 341,62	2 939,16	3 732,99
	+ затраты на объявление в СМИ			

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

1. Аукцион состоится в 15.00 3 января 2019 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.

2. **Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:**

2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;

2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);

2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в филиал 633 АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY21633, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 27 декабря 2018 г.;

2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.

3. По лотам №№ 1 – 4 осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками и документацией. Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста управления землеустройства райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.

5. Аукцион по каждому лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с районным (сельским) исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок, после его заключения, государственную регистрацию права на земельный участок;

в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;

в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;

обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40 «Об утверждении и введении изменения в технические нормативные правовые акты в строительстве»;

согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;

юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;

осуществить строительство жилого дома в сроки, установленные законодательством, иного объекта – в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения и по 27 декабря 2018 г. включительно.

Контактные телефоны: 8(0174) 22 77 46, 22 55 23.